


# МІСТЫКА І ДЭТЭКТЫЎ АД АЛЯКСЕЯ ЯКІМОВІЧА

**Пра выхад новай аўтарскай кнігі прэс-службе СПБ-Гродна паведаміў вядомы беларускі пісьменнік са Слоніма Аляксей Якімовіч.**

Беларускі педагог, пісьменнік Аляксей Мікалаевіч Якімовіч вядомы ў асноўным як аўтар літаратуры для дзяцей і юнацтва. Тым не менш, у новую кнігу пісьменніка, зборнік «Пан» увайшлі дэтэктыўна-містычная аповесць і містычныя апавяданні.

Кніга «Пан», якая складаецца з дэтэктыўна-містычнай аповесці і дэтэктыўных апавяданняў, была ўключана ў спіс сацыяльна-значнай літаратуры і выйшла ў сакавіку 2021 года па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь у дзяржаўным выдавецтве «Беларусь».

Героі аповесці, што прыехалі адпачываць у санаторый, сустракаюцца ў лесе з Панам – міфічным гаспадаром лясоў, палёў і статкаў з казлінымі нагамі, рагамі і барадой. Гэты твор аб каханні, вернасці і здрадзе.

Дэтэктыўныя апавяданні з кнігі прозы Аляксея Якімовіча «Пан» вострасюжэтныя, напісаны на маральна-этычныя тэмы, якія хвалююць грамадства. Для шырокага кола чытачоў.

Кнігу можна заказаць у гэтым жа выдавецтве. Яна каштуе 7 рублёў 80 капеек.

Крыніца